ПАЛЕСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ




# «Да юбілею Якуба Коласа. Пінінчына»

Віртуальная экскурсія




*Я далёка цяпер*
*Ад палескіх раўнін,*
*А люблю ж я той край,*
*Бо яго родны сын,*
*І па ім маё сэрца баліць...*

Я. Колас

Палессе. Піншчына. Пінкавічы.
Менавіта тут жыў і працаваў амаль на працягу шасці гадоў наш славуты паэт, празаік, драматург і вучоны, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі, акадэмік
Якуб Колас

**Маршрут:**

# Пінкавічы - Пінск




Віртуальная экскурсія прысвечана тым старонкам у біяграфіі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, якія звязаны з Піншчынай.

Маршрут злучыць вёску Пінкавічы, дзе будучаму класіку давялося вучыць грамаце сельскіх дзетак, дом у Пінску, на былой вуліцы Вадаправоднай, дзе жыў Якуб Колас напярэдадні Першай сусветнай вайны і прыхадское вучылішча, дзе ён працаваў.



Канстанцін Міцкевіч



Ганна Юр'еўна Міцкевіч, маці Якуба Коласа



Бацька паэта Міхаіл Казіміравіч Міцкевіч

**Якуб Колас** (сапраўднае імя — Канстанцін Міцкевіч) нарадзіўся ў 1882 годзе ў вёсцы Акінчыцы (сёння — тэрыторыя горада Стоўбцы) у сям'і лесніка. У Канстанціна было яшчэ дванаццаць братоў і сясцёр. Але з-за недаядання і хвароб да дарослага ўзросту дажылі дзевяць.

Сям'я Міцкевічаў з-за прафесіі бацькі часта мяняла месца жыхарства. Таму адукацыю хлопчык атрымліваў спачатку дома, а толькі потым у школе. Канстанцін скончыў народную школу, а затым, у 1902 годзе, Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю.

Падчас вучобы захапіўся мастацкай літаратурай: чытаў як рускіх класікаў, так беларускіх і замежных аўтараў, пісаў уласныя вершы . Таксама праявіў сябе як этнограф — запісваў ў сшыткі народны фальклор.

У 1904 годзе малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч атрымаў прызначэнне ў Пінкавіцкую школу



Развітаўшыся з роднымі і сябрамі,
ён прыехаў цягніком на вакзал Пінска



Фанерны чамадан з няхітрымі пажыткамі ў адной руцэ, і звязаныя вяровачкай  кнігі - ў другой, так ішоў хлопец губляючыся ў здагадках, што гэта за Пінкавічы, якія там людзі і што яго чакае на новым месцы.

Такім, трохі разгубленым ад вакзальнай мітусні,
ён сышоў з цягніка і паспяшаўся на каралінскі рынак,
каб разам з пінкавіцкімі сялянамі дабрацца да месца працы.
Так апісвае свой прыезд у Пінск сам класік у аўтабіяграфічнай трылогіі "На ростанях".









Кірмаш


Краявіды Пінска, якія адкрыліся перад
поглядам Кастуся Міцкевіча

Дзень добры, новая мясціна!
Спаткай ты нас, як маці сына
Па часе доўгае разлукі,
І разгарні прыветна рукі
Для тых, хто змучаны ў няволі
Жывіцца хлебам твайго поля;
Зірні ты светлым вокам ласкі,
Авей крылом прыхожай казкі,
Каб гэта жыццё–пуцявіна
Была нам светлае часіна;
Узброй надзеямі нам грудзі,
Бо мы твае, зямелька, людзі!



Якуб Колас «Новая зямля»

# У Пінкавічах Канстанцін Міцкевіч працаваў настаўнікам з 1904 па 1906 год



Тут стаіць сціплы будынак –
«коласаўская» школа,
як цяпер называюць яе жыхары






**У 1990 годзе ў вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна ў будынку былой школы, дзе ў 1904-1906 гадах працаваў настаўнікам Якуб Колас, быў адкрыты літаратурна-этнаграфічны музей.**
**У музеі захоўваюцца запісы выступленняў Якуба Коласа і яго брата Іосіфа Міцкевіча, а таксама ўспаміны пра пісьменніка жыхароў Пінкавіч. Экспазіцыя музея размяшчаецца ў вестыбюлі і чатырох залах.**

# Першы пакой “Сялянская хата”.
# Там сабраны рэчы сялянскага побыту





**Наведвальнікі музея могуць пазнаёміцца з кухонным посудам, ткацкімі прыладамі, нацыянальным адзеннем, прыладамі працы. Усяго у сялянскай хатцы амаль сто экспанатаў**

# У двух другіх пакоях распавядаецца
# пра жыццё і працу Якуба Коласа ў вёсцы Пінкавічы
# і далейшы творчы шлях паэта





Стэнды пакояў знаёмяць наведвальнікаў з радзімай паэта, яго вучобай, шляхамі-дарогамі пасля Пінкавіч. Каштоўнымі экспанатамі музея з'яўляюцца фатаграфіі вучняў **Якуба Коласа** і іх успаміны пра свайго настаўніка. Цікавасць выклікаюць вершы, напісаныя Коласам у пінкавіцкі перыяд

На тэрыторыі музея знаходзіцца

**«Калодзеж Якуба Коласа».**

Кажуць, што вада з гэтай студні надавала прыродную сілу і энергію маладому беларускаму класіку.



Пінкавіцкі перыяд займае важнае месца ў біяграфіі паэта. Менавіта ў Пінкавічах бярэ пачатак літаратурная дзейнасць Я. Коласа. Паэт шліфуе свой педагагічны талент.
Тут ён пісаў вершы па-руску з паметкай "село Пинковичы"



Удзел у падпольным з'ездзе дзеячаў адукацыі 9 ліпеня 1906 г. паставіў крыж на яго настаўніцкай дзейнасці – сход разагналі прадстаўнікі ўлады, а Міцкевіча пазбавілі права працы. Затым ён быў асуджаны на 3 гады, ўвесь час зняволення (1908-1911) правёў у Мінскай турме



Выйшаўшы з турмы, Якуб Колас зноў звярнуўся да выкладання. У маі 1912 года Якуба Коласа накіравалі на працу ў Купяціцкую школу, а восенню перавялі ў горад Пінск, дзе ён працаваў у 3-ім прыхадскім вучылішчы

Непадалёк ад пінскага вакзала растуць тры магутныя яліны. Каля іх стаіць стагадовы дом фельчара чыгуначнай станцыі Арсенія Аляксандравіча Балевіча. Вуліца Івана Чуклая, 63 (былая Вадаправодная).



На сцяне каля ўвахода знаходзяцца адразу дзве шыльды.
Першая паведамляе, што гэты дом уключаны ў
**Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.**
Другая тлумачыць, што тут з 1912 па 1915 год жыў
пісьменнік **Якуб Колас**



Канстанцін Міхайлавіч выкладаў у 3-ім прыхадскім вучылішчы.
Знаходзіцца гэты будынак на вуліцы Чыгуначнай,7
Там  настаўнічаў народны паэт Беларусі Якуб Колас.
На сцяне будынка была ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар
пісьменніка, якую знялі ў 2007 годзе.
Зараз будынак пустуе.



У Пінску  Кастусь Міцкевіч знайшоў сваё шчасце і каханне ўсяго жыцця, настаўніцу пінскай чыгуначнай школы, Марыю Дзмітрыеўну Каменскую. У 1913 г. яны абвянчаліся. Так нарадзілася сям'я паэта.
У шлюбе з Марыяй Каменскай беларускі класік пражыў 33 гады. У іх было трое сыноў: Даніла, Юрка і Міхась.












25 ліпеня 2015 года ў Пінску на званіцы Свята-Варварынскай царквы ўрачыста адкрылі мемарыяльную дошку ў памяць аб вянчанні ў гэтым храме Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа) і Марыі Дзмітрыеўны Каменскай

З гэтай нагоды ў горад над Пінай прыехалі нявестка пісьменніка і дзве ўнучкі



Цудам захавалася адна з рэчаў Якуба Коласа.
Гаворка ідзе пра невялікую вытанчаную кушэтку.
Яна знаходзіцца ў Музеі Беларускага Палесся



Канстанцін Міхайлавіч даваў прыватныя ўрокі дзецям чыгуначнікаў і духавенства. Яркае ўяўленне пра гэты перыяд жыцця Якуба Коласа дае яго аповесць «У глыбіні Палесся», якая ўваходзіць у трылогію «На ростанях».







# Любімыя мясціны Якуба Коласа ў Пінску

Адным з натхненняў Якуба Коласа ў нашым горадзе, з'яўлялася рака і непаўторны від узбярэжжа з кляштарам і касцёлам - візітоўка старажытнага Пінска.



«Зацятаю грознасцю і панураю суровасцю вее ад гэтых старасвецкіх муроў, а манастыр мае выгляд непадкупнага вартаўніка аджытых рэлігійных традыцый старасветчыны. Як непарушная скала над морам, стаіць над балотамі гэты маўклівы волат, аглядаючы неасяжныя разлогі Пінскага Палесся на далёкія дзесяткі вёрст.» («На ростанях»)



*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары – лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць;*

*Гэтых гмахаў безгранічных*
*Балатоў тваіх, азёр,*
*Дзе пад гоман хваль крынічных*
*Думкі думае прастор;*
*Дзе ў восень плачуць лозы,*
*Дзе вясной лугі цвятуць,*
*Адзначаюць гожа пуць?*



Пісьменнік атрымліваў асалоду ад прыгажосці Палескага краю.
«…дзе Піна падаецца ўбок зарэчных балот… самы крайні паўднёвы рог Пінска.»

У гэты перыяд Якуб Колас становіцца дастаткова вядомым паэтам і піша шмат літаратурных твораў пад уражаннем нашага ўнікальнага краю, багатай гісторыі народа.

Знаходзячыся ў Пінску, Якуб Колас апублікаваў палескую легенду "Матчына прывітанне", "Казкі жыцця", аповесці "На начлезе", "Хмаркі" і добры дзясятак вершаў.









Яркае ўяўленне пра гэты перыяд жыцця Я.Коласа дае яго аповесць «У глыбі Палесся», якая ўвайшла ў трылогію «На ростанях».

Піншчына натхніла пісьменніка на аўтабіяграфічны раман-трылогію.










У сваіх творах пісьменнік з асаблівай цеплынёй гаворыць аб нашым краі.

Аповесці маюць яскрава выражаны біяграфічны характар.

Многія сябры і знаёмыя па Пінску і Пінкавічах сталі прататыпамі герояў гэтага твора.

У Пінску было напісана больш за дзесяць вершаў і апавяданняў. Тыповыя характары беларускага селяніна-працаўніка таксама ўзяты з жыцця на Піншчыне.







Тут, у Пінску Якуб Колас напісаў першыя раздзелы вялікага, непаўторнага твора – паэмы "Новая зямля»


Пінскае Палессе ў жыцці і творчасці
класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа
займае асаблівае месца.
Тут, сярод простых палешукоў, ён знаходзіў
выявы сваіх літаратурных герояў.
Яго натхнялі рака Прыпяць, лясы, пералескі,
раўніны і забытыя Богам палескія вёсачкі.




У нашым горадзе ёсць вуліца імя беларускага народнага песняра, яго імя носіць гарадская дзіцячая бібліятэка, у Музеі Беларускага Палесся захоўваюцца дзесяткі экспанатаў, звязаных з жыццём і творчасцю класіка беларускай літаратуры





Пісьменнік пакінуў пасля сябе вялікую спадчыну нам і нашым нашчадкам. Яго кнігі чыталі, чытаюць і яшчэ будуць чытаць бясконцую колькасць гадоў. Пакуль жывуць яго творы, жыве і сам паэт. **Якуб Колас** назаўжды застанецца адным з найвялікшых і вядомых пісьменнікаў Беларусі, без якога сёння немагчыма ўявіць беларускую літаратуру.

## Якубу Коласу

Мы вылятали з-пад твайго крыла,
Як птушаняты, у палёт свой першы.
І праз гады нас вабіла, вяла
Пявучая і поўная святла
Паэзія і праўда тваіх вершаў.

Няхай нам тых не дасягнуць высот,
Дзе ты лунаў, нібы арол свабодны,
Ты навучыў нас, як любіць народ,
Як з ім ісці плячо ў плячо ўпярод
І як адданым быць краіне роднай.

*Эдуард Валасевіч*

# Выкарыстаныя рэсурсы:

Усе фатаграфіі ўзяты з адкрытых крыніц інтэрнэту

https://goo.su/2dveVs
https://goo.su/MC8K54U
https://goo.su/YP3eSO3
https://goo.su/za9sjq
https://goo.su/nyfGd0b
https://goo.su/kMfm
https://goo.su/z0IAMX5




г.Пінск
вул.Пушкіна,4
Бібліятэка Палескага
Дзяржаўнага універсітэта
Складальнік:
Бібліятэкар
Дз.М.Саковіч